Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу—20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнцыі, прысланые у рэдакцыю, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей, хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год X. | 14 Марца 1915 г. | № 10

## Кліч да згоды.

Як з асобных людзей, с шэрых хлебаробоў, з сагнутых ад цяжкай працы рабочых складаюцца грозные палкі войска, каторае пралівае кроў сваю і чужую у страшэнным змаганьні,—гэтак сама з асобных народоў складаецца ўся Расейская дзержава. Ды толькі цяпер, калі вайна ўскалыхнула ўсю старану, народы, што жывуць у межах Расеі, ўбачылі адзін аднаго, зразумелі, што сіла дзержавы крыецца ў іх жэ сіле, і, ўцяміўшы гэта, пачалі пільна прыглядацца да суседзёў, пачалі шукаць дарогі да *сьведомай* еднасьці, да супольнай працы дзеля супольнай карысьці.

Скрануліся ўсе нацыі нашага краю і сумежных з ім, а ў тым ліку—палякі.

Над Польшчай засьвяцілася зорка новай будучыны Польскі народ ужо прыступаецца да будоўлі фундамэнтоў новаго жыцьця свaей старонкі, але не забывае пры гэтым аб сваіх земляках, што жывуць у Беларусі, Украйне, Літве. Між паступовымі палякамі чутны галасы аб тым, каб уладзіць згоду з суседзкімі краямі, каб тамтэйшым палякам забеспечыць права на свабоднае нацыянальнае развіцьце, на культурную працу дзеля сваей нацыі.

Пачала гэту гутарку варшаўская газэта «*Prawda*».

„Prawda“ пішэ, што палякі ня хочуць панаваць у нашай старонцы.

„Нашы“ палякі робяць усё, каб толькі займаць тутака першае мейсцо, каб, як у часах Польшчы, захаваць свае „placówki“ *гаспадароў* краю.

„Prawda“ пішэ, што палякі ня могуць быць небаспечнымі для нас.

„Нашы“ палякі, нават „паступовые“, тымчасам падсоўваюць расейцам праект „падзяліць“ беларусоў: каталікоў аддаць палякам—дзеля апалячэньня, праваслаўных—расейцам, каб зліліся з імі ў вадно. Яны публікуюць фальшывые карты, дзе паказываюць, што каталіцкая Беларусь—гэта „чыста польская земля“, што жыве ў ёй ад 50 да 100°/₀% палякоў...

„Prawda“ кажэ, што палякі хочуць памагаць нам у культурнай рабоці, лічаць гэта сваей павіннасьцю.

„Нашы“ палякі маюць іншую павіннасьць: апалячываць беларусоў-каталікоў, колькі сіл, даваць прасьвету *толькі па польску*, значыць, пад варункам апалячэньня.. Такіх палякоў, што вучылі-бы беларуса-каталіка па беларуску,—німа зусім, а калі ёсьць, то іх можна палічыць на пальцах аднэй рукі.

„Нашы“ палякі жаданьне беларусоў завясьці родную мову ў касьцёлі лічаць за... аб'яўленьне вайны польскаму народу!

„Нашы“ палякі—земяне ня бачуць селяніна-беларуса, каторы іх корміць сваей працай, — за тое умеюць казаць пекные словы аб патрыотызьме...

„Нашы“ палякі—прогрэсісты і і лібэралы неўважаюць на беларускую нацыональную работу, і німа ў нашым краю такой польскай газэты, такой польскай грамадзкай організацыі, каторая шчырым словам звярнулася-бы да беларусоў: апрача вечных напасьцяў, апрача брэхліхаго абвінавачываньня беларусоў ў выдуманых сьведома „праступках“ мы ад іх ня чулі нічога!

„Нашы“ палякі думаюць аб сабе — і толькі аб сабе. Яны гатовы сябраваць толькі с сільнымі, але беларускі народ, хоць і мае 9 мільёноў душ, ешчэ толькі што ступіў на дарогу да нацыональнаго адраджэньня і ў іх вачах сілы ня мае. І „нашы“ палякі з ім *ня лічацца — ня хочуць лічыцца.*

„Нашы“ палякі інтэлігенты кажуць, што яны маюць поўна работы «для сваіх» — для «польскаго селянства і пролетарыяту» на нашай зямлі. Але-ж польскаго «дэмоса»—на сьмех малая жменя. А поруч з гэтай жменяй—мільёны цёмных і галодных беларускіх селян, каторые йшчэ блізка зусім ня маюць сваей інтэлігенцыі, для каторых німа каму працаваць.. Працаваць для тых мільёноў—гэта для „нашых“ палякоў „грэх“, „здрада“, хоць колькі між імі сыноў таго-ж беларускаго народу!

Пекные, шчырые думкі аб згодзі, каторые высказываюць палякі там — у Польшчы, можна толькі шчыра прывітаць. Згода між сумежнымі краямі, між народамі-суседзямі — гэта справа пільная, роўна важная для ўсіх. Але тут—на нашай зямлі—палякі нічога не зрабілі і ня робяць дзеля гэтай згоды. Яны не разумеюць, што прайшоў час панаваньня над намі і трэба цяпер адслужыць нашай старонцы, трэба ня толькі называцца, але і быць грамадзянамі яе, трэба карміць галоднаго і асьвечаць цёмнаго селяніна ня толькі затым, што ён—„свой“, што ён „пераробіцца на паляка“, але затым, што гэта—сьвятая павіннасьць. А раз гэта павіннасьць, а не ласка, дык і вучыць беларуса трэба не так, як хочэ вучыцель, а так, як гаварыць народ, каторы, захаваўшы сваю мову праз сотні гадоў, выявіў ясна сваё жаданьне *аставацца* беларусам.

Словы не заступяць дзела. І дзеля таго, каб беларускі народ мог с шчырым сэрцэм гаварыць аб згодзі ня толькі с Польшчай, да каторай ніякай крыўды ня мае, але с „тутэйшымі“ палякамі, трэба, каб гэтые нашы суседзі на дзеле споўнілі тое, да чаго клічэ «Prawda». Пакуль гэтаго ня будзе, яны астануцца для беларусоў гэтак сама чужымі, як чужымі былі палякі-паны ў часах прыгону.

Трудна даць веры, каб „нашы“ палякі пайшлі па дарозі, на каторую здаўна—клікалі іх мы і каторую намечае «Prawda»: лішне многа ў сэрцах іх самалюбства, лішне многа пагарды да тых, над кім прывыклі панаваць і хто цяпер пачуў сябе вольным чэлавекам, захацеў жыць *сам сабой.*

Хай яны скажуць сваё слова: чарод за імі!

а—н—а.

## ВАЙНА.

**На Ўсходнім фронце.** (*Тэлеграмы П. Т. А. ад Штабу Верхоунаго Глаунакамандуючаго*).

5 марца на фронце між рэкамі Шква і Ожыц, ў районі вёсак Сэрафін, Тартак, Вах, Зёмэк, а такжэ ў районі к поўначы ад Прасныша бітвы не спыняюцца, маючые мейсцовае (не агульнае) значэньне. Расейцы здабылі некольні вёсак і узгоркоў, прычым узялі 5 гармат, 42 кулемёты, яшчыкі з набоямі і некалькісот палонных немцоў. На правым беразі Нёману адбываецца бітва каля Таўрогена і на нямецкай зямлі на шляхах ад Гожды к Мэмэлю. Расейцы захапілі тут 2 гарматы, 4 кулемёты, 2 грузавые аўтомобілі з ваеннымі запасамі, а такжэ узялі палонных. На левым беразі Віслы сільная гарматняя стрэляніна. На Бзуры і ў районі Піліцы, каля Богусланоў што на захад ад Опочно, і Лопушно кінуўшаеся у атаку непрыяцельскае войскэ было разсеяно расейскім агнём.

6 марца. На левым беразі Нёману расейцы пасьля бітвы занялі Вэнсэе. Расейская конніца гналася за атходзіўшымі на Сэйны немцамі. У напрамку Прасныша і Остролэнкі адбываюцца мейсцовые бітвы за аддзельные вёскі і узгоркі.

7 марца. На правым беразі Нёману немцы, пасьля бітвы, аткінуты с Таўрогена за расейскую граніцу. Другі расейскі атрад дасьцігнуў Мэмэля а 8 г. вечэра 5 марца і пасьля бітвы на вуліцах, у каторай памагалі немцам жыхары, заўладаў горадам. На левым беразі Нёману ў бітвах апошніх дзён немцы змушэны былі пакінуць вёску Пільвішкі і аколіцы к усходу ад лініі Озеро—Дуся—Копцёво. На правым беразі Нарэва бітвы адбываюцца аддзельные. Атака немцоў ад Мышынца у напрамку ад Кадзідло была для іх зусім неўдачная. Немцы наступалі густымі атрадамі (колоннамі) і мелі вялікіе страты. На левым беразі Віслы без перамен.

8 марца. К захаду ад сярэдняй часьці Нёману расейцы далей наступаюць карысна. На іншых фронтах без перамен.

9 марца. Ад Нёману да Віслы і на левым беразі гэтай рэкі важных перамен німа. Расейскае войска наступаўшае ад Таўрогена, заўладало Луказргеном, гдзе узята палонных а такжэ склад ваенных прыпасоў і інжэнерных прылад.

10 марца. Расейскі атрад, каторы быў у Мэмэлі, адыйшоў на расейскую зямлю. На левым беразі Нёману, ў районі Марыямполя, расейцы адбілі атаку немцоў з вялікімі для іх стратамі На шасе Кальварыя — Сувалкі, непадалёк Шыплішак, расейская конніца, скарыстаўшы с цемнаты і сьнежнай мяцеліцы, ўрэзалася ў нямецкі абоз і знішчыла часьць абароны, захапіўшы рэшткі у палон, а такжэ ўзяўшы шмат вазоў с правіянтам. Артылерыя Осовца дасьцігла значных рэзультатоў. Стрэляніна нямецкіх гармат па крэпасьці значна аслабла. На іншых участках, на правым беразі Нарэва і на левым беразі Віслы асаблівых перамен німа.

11 марца. На правым беразі Нарэва, на фронце ад Шквы да Ожыца, ўлучываючы і яго правы бераг, бітвы за асобные апорные пункты перайшлі, ў болей агульны і страшэнна заўзяты характар. Немцы атрымаўшы тут падмогу

за рахунак іншых фронтоў, заядла баронюць занятые імі пазыціі, з незвычайнай моцай абстрэліваючы гарматнім агнём і кідаюцца сьвежымі сіламі ў заўзятые проці-атакі. Расейская войска, аднак, памалу пасовываецца наперад, здабываючы акопы і узгоркі. Звертаюць на сябе увагу вялікіе рукапашные схваткі каля Ваха, Караскі і Еднорожыца, ў каторых расейскае войска, атакаваўшае з неаглядпай храбрасьцю, узяло верх над немцамі. Расейцы захапілі каля 300 палонных, 8 кулямётоў і 2 мінамёты. На левым беразі Віслы важных перамен німа. Немцы былі змушэны пакінуць двор Доманевіцэ, што на Піліцы, у каторым расейцы уцьвярдзіліся. Непрыяцельскіе ў гэтым районі проціатакі адбіты. (П.Т.А.).

**У Галіччыні.** 6 марца. У Карпатах 5 марца праціўнік безкарысна вёў атакі на расейскіе пазыціі на фронце Ценжовіцэ—Горліцэ—Ропіца Руска і на напрамку Мункач—Стрый. 7 марца. У Усходней Галіччыні бітва адбываецца на поўнач ад Надворнай. Праціўнік займае сільна умацаваную пазыцію. 8 марца. У Карпатах значную перамогу расейцы атрымалі ў районі Свідніка і Смольніка, дзе расейцы здабылі некаторые участкі глаўнай непрыяцельскай пазыціі. Усе атакі непрыяцеля у напрамках Ужок і Мункач расейцы карысна адбілі. 9 марца. У Карпатах заўзятые бітвы. На шляхах к Барфэльду, ў далінах Ондавы, Лаборчы, непадалёк Лупкоўскаго перэвалу, і на левым беразі верхняго Сану расейскае войска карысна пасовываецца наперад, прабіваючы сабе дарогу стрэлянінай і штыхамі. На Мункачскім напрамку густые калонны немцоў атакавалі расейскіе пазыціі каля Росохача, Оравчыка і Козювкі, але ўсюды былі адбіты расейскім агнём і проці-атакамі, пры гэтым немцы мелі вялікіе страты. У Усходней Галіччыні сьнежная мяцеліца. 10 марца. У Карпатах расейскае войска карысна пасовывалося на фронце Зот, ад Дуклінскіх праходоў да верхняго Сану. Атакі непрыяцеля на Ужокскім напрамку адбіты. 11 марца. У Карпатах расейскае войска пасовываецца наперад і здабыло за мінуўшые суткі некалькі умацаваных высот на фронце паміж напрамкамі на Бартфэльд і Ужок. Усюдах непрыяцель вёў стрэчные атакі але без карысьці. Ва ўсіх бітвах у Карпатах, як заўсёды, расейцы захопліваюць шмат палонных і ўселякай ваеннай здабычы.

9 марца раніцай аддалася расейцам крэпасьць Перамышль. Перад тым, як здаць крэпасьць, аўстрыякі меціліся прабіцца цераз акружаючае расейскае войска к сваім, але не ўдачна. Апошніе пару дзён яны вялі сільную гарматнюю стрэляніну з мэтай выстрэляць усе набоі, каб іх не засталося для расейцоў. Форты, масты і іншые умацаваньня аўстрыякі ўзарвалі. У апошні дзень перэд здачай абаронцы Перэмышля атрымалі апошні хлеб, які быў у крэпасьці. Расейцы узялі ў Перамышлі 100.000 з лішнім салдат і каля 2.500 афіцэроў і чыноўнікоў.

**На Каўказкім фронце** бітвы у апошні тыдзень адбываліся у Захарохскім краю, у Ольцінскім напрамку і ў Алашкертскай даліні. Вялікай перэвагі на чыю колечы старану, як можна судзіць з вестак Штабу, бітвы гэтые не прынесьлі.

**На Захадніи (француским) фронце**—нічога важнаго.

**На моры.** 5 марца у часе абстрэліваньня хаўрусьнікамі Дарданелоў туркі затапілі 2 броненосцы англіцкіе і адзін броненосец француські, а другі француські броненосец вельмі папсавалі. Страта гэта для хаўрусьнікоў, як кажуць знатакі, дужа вялікая.

## На вайне і каля вайны.

**Сучасная і даўнейшая крэпасьць.** Цяпер, калі расейцы, пасьля некалькі месяцоў абароны, здабылі у Галіччыні крэпасьць Перамышль,

ня лішнім будзе сказаць колькі слоў аб устройстві цяперашняй і даўнейшай крэпасьці.

Крэпасная тэхніка апошняго дзесяцілецьця, якой прыйшлося змагацца з вялізарна ўзрастаючым калібрам арудзій, прызначэных для зруйнаваньня узмацаваньняў, выдумала соткі розных способоў абароны, якіе «і ня сьніліся» нашым прэдкам. Цяперашняя крэпасьць або патрэбуець ад асаджаючых страшэнна вялікіх і нестасоўных ахвяр (як паказывае, напр., штурм Льежа, крэпасьці не першакласнай), або можэ праціўіцца датуль, пакуль у гарнізона хопіць харчоў і ваенных запасоў.

Старасьвецкіе крэпасьці, як вядома, расьлі ў вышыню. Рыцарскіе замчышчы, каторые былі папраўдзі крэпасьцямі, па сягоняшні дзень захопліваюць нас сваімі вартавымі баштамі, зубатымі сьценамі з вузкімі бойніцамі, вісячымі бальконамі, пад'ёмнымі мастамі... Калі-ж пачала, развівацца артылерыя, то крэпасьці ўсё робіліся ніжэй: башты сталі ня толькі непатрэбны, але і шкадлівы, дзеля таго што служылі прыцэлам для прыстрэлу; згінулі зубцы сьцен, каторые ужо не маглі бараніць ад ціжарных знарадоў; нарэсьці самі сьцены аказаліся непрыгоднай заслонай. Каменные будоўлі уступілі мейсцэ бэтонным. Крэпасьць пачалі акружаць рады фортоў, нізенькіх, з гладкімі зямельнымі пакатасьцямі, з-за якіх чуць-чуць відаць дулы сучасных арудзій. Ма ла таго: шмат будоўляў ня толькі прынізіліся роўна з зямлёю, але і *схаваліся у зямлю.* Увакруг крэпасьці ідуць пад'зямельные калідоры і праходы, прызначэные дзеля таго, каб можна было затрымаць ворага, дабіраючагося к фортам «сапой». З вышыні старасьвецкіх башняў цяперашніе абаронцы крэпасьцей спусьціліся на зямлю і нібы кроты зарыліся у яе. Так-сама новые способы знайшла цяперашняя тэхніка і для абароны крэпасьці ад простай атакі «штурму» або «прыступу». Загароды с калючаго дроту, густымі кустамі абхопліваючые цяпер форты, або «воўчые ямы», так-сама с каламі на дне, зусім мала розніцы маюць ад «кіпячэй смалы», каторую калісьці лілі асаджоные на штурмуючых іх ворагоў, або ад «гаручых стрэлоў», якімі гарнізон пробаваў падпаліць праціўны лагер. Але другіе рэчы абароны, бязспрэчкі болей моцные і страшные, ўжо зусім—творчасьць нашаго часу. Да іх належыць, напр., электрычны ток прапусканы па дроту, які абхопліваець крэпасьць. Да іх належуць яшчэ міны і фугасы, абараняючые ўсе подступы да крэпасьці. Чэлавечая прыдумка уладзіла некалькі способоў падміновываць дарогі: можна рабіць гэта так, што ўзрыў раздаецца пасьля таго, калі ўжо асобны вартаўнік злучыць электрычны ток; можна і так, што міна ўзарвецца сама сабой, як толькі на вядомае мейсцо наступіць чыя колечы нага, нарэсьці—так, што міна ўзарвецца толькі пасьля таго, як вялікая частка ідучаго на прыступ войска пройдзе праз яе, прычым згінуць ня толькі першые рады (як у другім выпадку), але ўсе, цэліком. Прыдуманы яшчэ асобые, пад'зямельные мінные аттакі, дарогі, па якіх праведзены электрычные токі і т. пад.

## Думкі мужыка.

1.

О, люба мне, што нарог сьмелы так складна тне папар задзерванелы; трашчаць карэньня, земля шуршыць, скрыгочуць каменьня і склад, як пласт, ляжыць, і ўвесь папар загонамі бугрыць.

О, люба мне, што з неба Бог глядзіць тым ясным вокам, што я мужык, не занямог, а праваджу нарокам баразну за баразной роўненькай струной. Зямелька пахне, небо пяець, а радасьць, шчасьце грудзі мне рвець, і сілы маей нікому не спазнаці, бо са мной Бог і зямелька маці.

О, люба мне, што я мужык!

2.

*«Лапці ды сермяга—мужыцкая павага».*

Я пэрэканаўся, што на сьвеці бадай што німа нічога зусім здароваго. Кожны мае свайго рабака. Я чуў, ад разумных людзей, што нават сонцэ мае чорные плямы, а як я думаю, то і сам чый-небудзь бог не без таго, каб ня меў якогась фэлеру. Возьмім хоць сабе Паўлюка. Ён заўсёды мазгуе, каб як кемна падыйсьці да Юдэля ды вымэнчыць у яго на павер колькі

## СЯРОД МАГІЛ.

Сярод магіл, на плечы ўзняўшы крыж свой, стану,
Як пасланец з магіл ад сьпячых там пракокоў,
І ў даль сягну, дзе толькі можэ сягнуць вока,
І скрось туды, дзе вольнай думкаю дастану.

І кліч пушчу скрось ад кургану да кургану,
Як віхроў лёт па ўсей бязмежнасьці шырокай,
Кліч-закліканьне векавечнаго зарока,
Што ў гусьлях толькі дрэме, ў песьню ўчараваны.

Прадсьмертнаю кляцьбой канаючаго раба,
Малітвай грэшніка заразаўшаго матку
Зьвярнуся к сонцу, сонцу без канца й пачатку!

Хай спаліць мне душу, як ствол разьбіты граба,
Хай вочы высмаліць, як кветку ў лільі слабай,
Але і крыж мой спапяліць хай папарадку!

15/II—15 г.

**Янка Купала.**

## „СТРАЖНІК“ *).

II

Каляды ў вёсцы Лапцевічах кожны год праходзілі адзінакава. Бабы варылі куцьцю, пяклі скваркі, кілбасы, мужчыны хадзілі да Сарабасі, хлопцы і дзеўчаты ладзілі вечарынкі, гулялі, хадзілі з мядзьведзям, с казою, варажылі. А то дык дзе-небудзь возьме ды спляцецца вясельле, ну, тады пойдзе пэцеха! Адным словам усё было добра і йшло ў лад Мужчынскае зборышчэ было ў Сарабасі, жапочае ў старой бабы, Базыліхі, а ўся моладзь зьбіралася ў Амільяна Касапузенкі. Першае—гэта тое, што ў Амільяна была дачка Манька, як кажуць, «кроў з малаком», а другое, што й сам Амільян любіў шчабетаньне вясковай моладзі. Бывала, як толькі якое сьвята, ці нядзеля, дык так і знай, што ў Амільяна ў хаце сьмех, гоман, песьні, і ўсюды пачуеш: «Пойдзем к Амільяну», «пойдзем да Касапузаго».

Але гэтымі Калядамі было ня тое. У вёсцы Лапцевічах, куды, як кажуць, і варона косьці не заносіць, пайшла чутка, што к Новаму году да Амільяна прыедзе яго брат Міхалка, што служыў недзе стражнікам. Моладзь не так ужо зьбіралася да Амільяна, ды й самы Амільян і Альжбета былі самі—не свае.

Якраз на другі дзень Каляд стараста хадзіў у воласьць і прынёс Амільяну пісьмо, але як ён быў неграматны, то стараста яму яго й прачытаў. Пісьмо было ад Міхалкі. Ен пісаў, што ўжо выехаў, і к Новаму году думае прыехаць да дому і прасіў, каб яны вымылі хату, бо ён прывык жыць у чыстаце.

— «Вот бачыш»,—казала Альжбета:—«шчэ да дому не прыехаў, а ўжо камандуе, каб тутака яму і чыста і хараша, а што-ж будзе, як пажыве тутака, ды ўбачыць, як мы жывём?»

Васіль і сам ведаў, што жыць у двух з Міхалкам ён ня будзе, але ён развяжаў сябе і жонку.

— «Дармо, маці, не бядуй; ты чула, што Сарабася казала, што так будзем жыць аж толькі людзі завідываць будуць».

— «Хіба,—скажы, сьмеяцца будуць людзі»,—атказала Альжбета.

На трэці дзень вечэрам Амільян пайшоў да Сарабасі. Там была паўнюсінька хата.

— «А тут ужо гаварылі, што Касапузы памёр»,—сустрэў яго Васіль Апранік. «Плюнь, суседзе, на ўсё — жыві пакуль жывеш».

— «А мне чаго ўміраць?»—атказаў Амільян: «вось табе дык даўно ўжо трэба-б было пасланць павестку, а ў мяне йшчэ дзеці малые».

— «На дзеці скора дзяцька прыедзе», — кальнуў Амільяна сусед Мікалай, каторы даўно быў злосян на яго; і ён пачаў сьмеяцца, пазіраючы то на таго, то на другога, думаючы, што ён сказаў натто сьмешна.

— «Але табе чаго тутака трэба?»—адразу асек Мікалая стараста: «Ляпне, ўсёроўна, як с куста. Калі ня ведаеш, што сказаць, дык лепей моўчаў-бы»,—і стараста плюнуў і пайшоў на двор. Усе зарагаталі; Мікалай зачырванеўся і засароміўся, быццам яму паганым дзеркачом у зубы ткнулі, і адразу змоўк, толькі адны вочы блішчэлі с кутка, ўсёроўна, як у галоднага воўка.

Бачучы, што німа чаго рабіць у Сарабасі, Амільян завярнуўся і пайшоў да дому, бо яму неяк брыдка было, што Мікалай прытыкае яму братам.

— «Ведаеш што, Амільян»,—пачала Альжбета да яго, як яны селі вячэраць· «трэба будзе нам узяць трохі жыта ды завесьці да майго бацькі. Падумай ты сам, што-ж мы будзем рабіць, як падзелімся. У Міхалкі ёсьць грошы, ён сабе купіць, а што мы зробім з гэтай драбнатой. Ты ня дужы, я зноў нікуды не варта, дзеці малые, адна Манька, але што-ж яна зробіць адна».

— «Дык яно то гэтак, але каб ніхто не бачыў. Бо як убачуць, як будзем везьці, дык тады жыцьця ня будзе ад Міхалкі. Ты-ж ведаеш, калі ён яшчэ малы кідаўся на мяне с тапаром, а цяпер то й пагатові не пашкадуе».

— «Ды хто цяперака будзе хадзіць ды глядзець. Вось вячэрай, я пайду запалю лу-

*) Гл. „Н. Н.“ № 9.

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны.

**Гаспадарскіе курсы.** Урад пазволіў казённаму агроному ломжынскай і сувальскай губ. наладзіць у Вільні гаспадарскіе курсы для селян-уцекачоў з мейсцоў захопленых вайною.

**Губэрнатарскі цыркуляр.** Віленскі губэрнатар разаслаў паветовым ісправнікам і віленскаму паліцмайстару цыркуляр, у каторым звертае увагу, што с прычыны пашыраных сярод жыхароў фальшывых пагалосак, нацковываючых адну часьць грамадзянства проці другой, паўстае безпатрэбная паніка, і вось дзеля гэтаго паліція павінна усімі сіламі не дапускаць да падобнаго з'явішча, а вінаватых цягнуць к атказу павэдлуг абавязываючых пастановоў военнаго часу.

**Спраўкі аб хваробах.** Віленскай паліціі загадано, каб акуратна падавала у лекарскую управу усе падробные спраўкі аб хворых на воспу, плямісты тыфус і паваротны тыфус, паказываючы у спраўках колькі сярод хворых ёсьць ваеннапалонных, асобна кожнай народнасьці.

**Плямісты тыфус.** Як паведамляе «Вил. ВѢстн.», некольки часу таму назад у лідзкім павеці пачаў шырыцца на людзях плямісты тыфус, каторы хоць і не мае эпідэмічнаго (пошэснаго) характару, але усё-ж такі лічба захварэўшых на тыфус бывае ад 30 да 50 душ.

**За напад на „казёнку“.** У віл. судавую палату паступіла справа 24 селян віленск. пав., вінавачэных у нападзі на манапольку ў Лаварышках. Летась у ліпні, узброеные кіямі і каменямі, гразілі яны сьмерцяй манапольшчыку і стражніку, а пасьля выламалі акяніцы і вокны ў казёнцы і забралі гарэлкі на руб. 300. У гэтым-жэ мястэчку і ў суседнім—Міцкунах, яны пасьля аграбілі 5 хат.

**Пажар.** У вёсцы Вухоўшчына, Маладэчынскай вол., вілейск. пав., згарэў паравы млын з лесапільняй і дом, належачые да М. Бруднаго, вартые болей 20.000 руб.; згарэла такжэ уселякай маентнасьці на 6.400 р.

## З Міншчыны.

**Растрата.** У Мінску на магілках застрэліўся член Мінскай дваранскай апекі І. Дэнісэвіч с прычыны зробленай ім у «апецы» растраты сірочых і ўдовіных грошай.

**Штраф.** Мінскі губэрнатар аштрафаваў на 1000 р. (або 2 мес. пасядзець) гандляра дрэвам Л. Жукоўскаго за тое, што ён прадаваў дровы даражэй устаноўленай таксы.

**Спажыўчае таварыство.** Маняцца аткрыць у Погосьці (слуцк. пав.). Пададзена ужо на зацьвярджэньне устава.

**Самаход паміж Ракавам і Івенцам.** Жыхар м. Ракова Н. Позняк стараецца аб пазваленьні наладзіць яму перавозку пасажыроў на аўтомобілі паміж ст. Заслаўем і м. Ракавам і паміж м-мі Ракавам і Івенцам.

**Жывёла для Бабруйска.** Бабруйскае гарадзкое праўленьне пастанавіло старацца аб пазваленьні на прывоз у Бабруйск жывёлы і мяса с палтаўскай і чэрнігоўскай губ. бо, с прычыны спадзеванай рэквізыціі жывёлы у горадзі і павеці, можэ не хапіць мяса.

**Помач сем'ям запасных.** У м. Острошыцкі-Гарадок, мінск. пав., аткрыта бюро для дапамаганьня сем'ям асоб пацярпеўшых на вайне. Такое самае бюро аткрыта у дварэ Горваль, рэчыцк. пав.

**Суд.** У Пінску акружны суд разьбіраў справу камандуючаго конна-паліцейскай стражай, ротмістра Панцэра, вінавачэнаго ў зьдзекаваньні («пытках») над хлопцам. Панцэра апраўдалі.

**Пажар.** У вёсцы Новасёлкі, навагрудзк. пав., згарэла 19 сялянскіх дамоў. Шкоды каля 15.000 руб.

**С Піншчыны.** *(Ад нашаго карэсп.)*. Растаўшый у пачатку лютаго сьнег у паўночнай часьці пінскаго павету аткрыў балоты, каторые прасохлі да таго у леташнім 1914 гаду, што цяпер абы толькі закінуць па неасьцярожнасьці агонь, каб балота абярнулося у возера. Гарыць у некаторых мейсцох цэлымі тыднямі. У ночы відны кругом страшные пажарышчы, а ў дзень цяжкае паветра і густы дым завалаківаюць ваколіцы. Бабы у вёсках ня хочуць верыць, што гэта гарыць балота, а ўвераюць самі сябе, што гэта—вайна.

Надовічы у гор. Пінску недалёка ад вакзалу згарэў аднаэтажны дзерэвяны дом. Страты некольки тысяч. руб.

У вёсцэ Конотопі, дабраслаўскай воласьці, у аднэй удавы захварэў сын, хлопец гадоў 18. Заместа таго, каб павесці хлопца да доктара, яна павезла яго да «знахара». Калі яны варочаліся, пабываўшы у знахара, да дому, хлопец на дарозі аддаў душу. Час-бы ўжо нам было пакінуць нарэшці свае старые прывычкі і не сьмяшыць людзей свaей цямнатою.

*Гаротнік.*

## З Гродзеншчыны.

**Аб пацярпеўшых ад вайны.** Дзеле сабраньня справак аб пацярпеўшых церaз вайну жыхарох беларускаго району гродзенскай губ. Літоўскі камітэт помачы ахвярам вайны атправіў у гэты район беларуса Алексюка.

**Вайна і адвакаты.** Камісія гродзенскіх прысяжных адвакатоў звярнулася с просьбай да прадседацеля віл. судовай палаты, каб у акружным гродзенскім судзе, перанесеным цяперака у Слонім, не назначаліся справы з учасьцем прысяжных адвакатоў з Гродны хоцьбы з аднэй стараны і каб гэткіе справы ужо вызначаные былі прыпынены.

**Самалёты.** «Вил. ВѢстн.» паведамляе, што напады непрыяцельскіх самалётоў на Беласток набіраюць характару штодзённаго з'явішча. Нямецкі аэроплан ізноў паявіўся над Беластокам 6 марца і на гэты раз больш гадзіны кружыўся над горадам.

**Набой.** У Гродні у часі вобыску у аднаго ваеннапалоннаго знайшлі рурку вялічынёю з муштук ад папероcы,—на выгляд, як набой ад рэвальвэра. Калі турэмные стражы пачалі калупацца у гэтай рурцэ, то наступіў узрыў, каторы аднаму с турэмнікоў адарваў пальцы на руцэ і асмаліў твар

# З усіх старон.

**Прызыў быўшых чужаземцоў.** Петраградзкі градначальнік растлумачыў прыставом, што ўступіўшые ў расейскае падданство чужаземцы мужчыны, не старэй ад 43 год узростам, павінны зараз-жэ явіцца к адбываньню ваеннай павіннасьці.

**Страхоўка.** Міністэрство таргоўлі апрацовывае праект страхоўкі параходоў і служакоў торговаго флоту на выпадак нешчасьцяў церaз вайну.

**Забарона.** Па загаду ваенных ўласьцяў адвакатам петраградзкаго округу судавой палаты забаронена бываць у лазарэтах і шпіталях іх кліентоў.

**Суды ў Сібіры.** Міністар юстыціі (судаўніцтва) прызнаў патрэбным пачаць апрацовываць праект права аб наладжэньні прысяжных судоў ва ўсіх округах і губэрнях Сібіры.

**„Крэсцьянскі банк“** ад пачатку вайны зьменьшыў сваю работу. Цяперака гэты банк не мае права купляць на свой рахунак панскіх двароў дзеля перэпрадажы іх селянам.

**Казённые запалкі (серніке).** Урад маніцца аткрыць побач с прыватнымі казённые фабрыкі запалак, гэта быцца дзеле таго, каб дзешавей пасьля прадаваць запалкі жыхаром.

**Аб жыдох.** Сэнат раз'ясьніў, што малалетніе жыды, да 14 год, ня могуць пераходзіць у хрысьціянство, калі іх бацькі па даўнейшаму астаюцца ў жыдоўскай веры.

**Справы аб убіўствах.** Начальнік кіеўскаго округу апавешчае, што на ўвесь час ваеннаго палажэньня справы аб убіўствах з мэтай грабежства вылучэны з агульнай падсуднасьці і будуць разгледацца ваенным судом.

**Аб арыштах.** „П.Т.А“ 4 марца паведамляе: „У апошніе дні пашыраліся чуткі аб арыштах асоб належачых да асобнаго корпусу жандармоў дэпартамэнту паліціі, západазроных якобы у шпегоўстві. Дзеля гэтаго вось міністэрство унутрэнніх справоў падаець да агульнай ведамасьці, што сярод арыштованных німа ані воднаго чына належачаго да корпусу жандармоў або да міністэрства ўнутрэнніх справоў, а толькі ёсьць служыўшые раней у корпусе жандармоў і ў міністэрстві, але звольнены ад службы даўно і с прычыноў не маючых нічога супольнаго з выжэй успомненым абвінавачэньнем.

**Сэквэстр дроў.** У Кіеві па загаду глаўнаго начальніка Кіеўскаго ваеннаго округу, с прычыны над'звычайнаго павялічэньня цэн і атказу прадаваць, сэквэстрованы (забраны на казну) запасы дроў ва ўсіх складах.

**Абавязываючай пастановай,** пад карай да 3000 р. або 3 мес. арышту, забараняецца вывозіць за межы Кіеўскай губ. ячмень, авёс, жыта, пшаніцу, грэчку, муку і крупы аж да часу скасаваньня гэтай пастановы.

**Абавязываючай пастановай** забараняецца шырыць весткі, скіраваные к разсеваньню національнай ненавісьці паміж рознымі народнасьцямі Каўказу.

**За зьневагу войска.** У Маскве папаў на 3 мес. пад арышт рыжскі мешчанін Ціммэрман за тое, што непрыхільна адазваўся аб машыруючым атрадзі войска.

**Растрата.** У Петраградзкім Тарговым Банку выкрыта растрата на суму 200 тыс. руб. з лішнім. Арыштовано аднаго с чыноўнікоў банку, каторы прызнаўся, што гэтые грошы прайграў.

**Проці падаваньня сабе рук.** У Уфе лекарская рада пастанавіла звярнуцца да жыхароў з адозвай, каб людзі с прычыны небаспечнасьці пашырэньня пошэсьці, не падавалі вітаючыся адзін аднаму рук.

**Адмова.** Вядомы дабрачынца Шахов, каторы заўсёды кожны год выдаваў колькі тысяч рублёў на бедных студэнтоў маскоўскаго унівэрсытэту, як плату за навуку, сёлета атказаўся даць гэту запамогу, ссылаючыся на тое, што яго не задавальнівае цяперашні настрой моладзі.

**„Філарэты“.** Начальнік Паўночна-Зах. чыгунак апавесьціў сваім падўладным, што яны маюць права запісывацца ў «Саюз ўсерасейскіх філарэтоў», каторы ставіць сабе мэтай наладжываньне вышэйшай і ніжэйшай поруч с школьнай навукі на асновах вернасьці праваслаўю, самадзержавію і расейскай народнасьці.

**У Польшчы.** У Варшаву апошнім часам прыбыло каля 25,000 безпрыпынных жыдоў. Разам с тымі, што перш уцяклі з мейсцоў захопленых вайноў, будзе ўсіх каля 80,000 душ.—Радомскі губэрнатар пасадзіў на 3 месяцы пад арышт камісара двара Стараховіцэ у ілжыцкім пав. Крушэўскаго за тое, што ён на жаданьне ваенных ўласьцяў атказаўся даць фурманку. — Як пішуць польскіе газэты у радомскай губ. найболей пацярпеў ад вайны гор. Опочно і яго аколіцы. Шмат вёсак і двароў знiстожэны да тла. Селяне, каб ратаваць сабе жыцьцё, парабілі акопы ў зямлі і там кватэравалі. Тые, каторые асталіся ў станцях або ў падвалах, кепска на гэтым выйгралі,—згінула с паміж іх каля 50 душ.

**У Галіччыні.** С Станіславова паведамляюць, што у часе, калі гэты горад быў заняты ізноў аўстрыякамі, каманіцу жалезнадарожго майстра, быўшаго аўстрыяцкім служачым і аказаўшаго вялікую помач расейцам пры будові поезду, знiстожыла таўпа да фундамэнту. На мейсцэ гэтаго дому цяперака пляц.—Начальнік галічанскіх чыгунак абвесьціў, што служачые, каторые едуць на службу у Галіччыну на гэтые чыгункі, не маюць права без асабліваго за кожным разам пазваленьня галіцкаго генерал-губэрнатара браць с сабою сваей сям'і.—4 марца у Кіеў з Галіччыны дзеле далейшай высылкі ў Томскую губ. ізноў дастаўлена 108 арыштованых жыхароў Галіччыны.

Рэдактар-Выдавец
**І. Луцэвіч.**

**ТАРГОЎЛЯ НАСЕНЬНЯ ІОСІФА ЛУР'Е, ЛІБАВА**

**у гэтым сэзоне пераехала у**

**г. Вільню, па Стефаноўскай вуліцы д. № 1—8.**

**Аддзел: па Шопэноўскай вул. д. Уцехоўскаго, проці вакзала.**

У складзі ёсьць вялікі запас **насеньня** найлепшых заграцічнага і расейскаго сортоў па умеркаваных цэнах.—Прэйскуранты высылаюцца па кожнаму патрэбаваньню дарма.—*Адрэс* для лістоў: **Іосіф Лур'е, Вільня**, для тэлеграм: **Заатлурье, Вільня.**

Друкарня Марціна Кухты, Татарская 20.